Мовазнаўства

І.А. ГАПОНЕНКА

УПЛЫЎ НЕСЛАВЯНСКІХ МОЎНЫХ ЭЛЕМЕНТАЎ НА ЛЕКСІКА-СЕМАНТЫЧНУЮ СІСТЭМУ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ПАЧАТКУ XX ст. (на матэрыяле газеты «Наша Ніва»)

Выявлены особенности влияния неславянских языковых элементов на лексико-семантическую систему белорусского языка начала XX в.: показаны масштабы процесса переименования понятий средствами принимающего языка, а также направления семантической дифференциации исконных и заимствованных слов.

The particular features of the influence of nonslavonic elements on the lexical-semantic system of the Belarusian language of the beginning of the XX century are revealed. The scale of the process of the counterappellation of the concepts by means of the receiving language and the directions of semantic differentiation of native and loan words has been presented.

На пачатку XX ст. разнастайныя фактары пазамоўнага і ўнутрымоўнага характеру пасадзейнічалі істотнаму папаўненню слоўніка тагачаснай беларускай мовы адзінкамі, запазычанымі з розных еўрапейскіх моў (Гапоненка 1999, 62-63). У ходзе асваення на лексіка-семантычным узроўні іншамоўныя словы не толькі самі прыстасоўваліся да прымаючага беларускага моўнага асяродцзя, але і аказвалі актыўны ўплыў на лексіка-семантычную сістэму мовы-рэцыпіента, стымулюючы разнастайныя семантычныя працэсы ў сферы спрадвечнай беларускай лексікі.

Тыповай формай рэакцыі на запазычанні ў разглядаемы перыяд быў падбор іх беларускіх адпаведнікаў і ўтварэнне беларуска-іншамоўных лексічных пар. Асабліва відавочна тэндэнцыя да перайменавання выяўлялася ў ходзе гласіравання іншамоўных слоў - прыёму, надзвычай характэрнага для пачатковага этапу ў працэсе запазычання*: *Шмат прыкладаў ў Расеи было, што тайная палиии/я памагала зладзеям рабиць крыминалы. У нас уся палиция дрэнная, трэба зрабиць рэформы (перамены)* (1908, № 14)**; *Вось и дадумалися людзи, што проци саюзоў прадаўцоў трэба паставиць саюзы купляючых - так-званые коопэрации (сулолки)* (1908, № 9); *Яны [мужыки] написали невялички закон аб зямли. Выбрали бюро (раду) безпартыйных мужыкоў* (1908, № 6).

Адзначаюцца выпадкі, якія можна назваць адваротным гласіраваннем, калі асноўным сродкам для выражэння паняцця выступала беларускае ці даўно запазычанае і глыбока адаптаванае іншамоўнае слова, а суадносныя запазычаныя лексемы ўдакладнялі яго занадта шырокае значэнне: *..саюз [«саюз рускаго народу»] разаслаў па вёсках сваих «агйтатороў», каб шырыць свае думки (идэи) меж мужыками* (1908, № 8); 22 atvftusfa *па Катагойсу Ыай и pawietry па masynie (aeroplanie) awiator Rank..* (1910, № 36).

" Традыцыя гласіравання запазычаных слоў была ўласцівай І для іншых славянскіх моў у перыяды актыўнага запазычання іншамоўных лексічных сродкаў, напрыклад, для рускай мовы XVIII ст. (Лексика 1981, 50-51) і ўкраінскай мовы XIX - пачатку XX ст. (Муромцева 1985, 73-74, 97-99) (Пры цытаванні захоўваюцца арфаграфічныя асаблівасці арыгіналаў).

У якасці фактагалагічных крыніц выкарыстаны «Слоўнік мовы "Нашай Нівы"». Мн., 2003. Т. 1, матэрыялы картатэкі «Слоўніка мовы "Нашай Нівы"» (Інстытут мовазнаўства НАН Беларусі) і арыгінальныя нумары газеты «Наша Ніва» (1906-1915).

Адносіны запазычанага і ўласнамоўнага слоў у глосах, як правіла, не мелі характару дублетнасці. Беларускія адпаведнікі перадавалі семантыку запазычання дастаткова прыблізна і служылі не эквівалентам, а толькі своеасаблівым семантычным арыенцірам для слоў іншамоўнага паходжання: *Гегечкоры ад социял-дэмократоў заявйў, што правые и акцябрысты недапускаюць у камисию левых, бо будуць там згаварывацца, з б ю р о к р а ци е й (ч ы н оў н и к а м и), а бюрократия давяла Расею* да *ганебных Цусимы и Мукдэна* (1908, № 4). Асабліва наглядна адноснасць семантычнай адпаведнасці запазычанага і беларускага слова праяўлялася пры гласіраванні слоў, якія абазначаюць рэаліі, неўласцівыя беларускаму быту ці жыццёваму ўкладу: *У Ирландии тры чацьвёртых часьци зямли арэндавалися дробными фэрмэрами (мужыкамі), а толькі 1 чацьвёртую часьць зямли трымали самы лорды (п а мешчыкі)* (1908, № 3); *Прусскае правицельства написало проект новаго закона аб выбарах и злажыло яго ў парлямэнт* прусски *(думу)* для зацьвярджэньня (1908, № 2); *Вось, паложым цяпер ва многих штатах (губэрнях) народ хочэ паменшыць плату за праезд на чугунцы* (1908, № 1).

У вялікай колькасці выпадкаў нават такіх прыблізных сінонімаў-замяшчальнікаў запазычаных адзінак сярод уласнамоўных сродкаў не знаходзіцца, і тады ў глосах падаюцца больш ці менш разгорнутыя тлумачэнні: *Шмат часу идзе на разгледаньне «бюджэту» (росписи даходоў и расходоў гасударства)* (1908, № 9); *Тады афицер Коваленскйй хацеў уздаць шоффэру (фурману на аўтомобйлю), але ён пусцйў у ход сваю машыну и уцёк* (1908, № 23); *Инстынкт - гэта бязведомае хаценне чаго кольвек* (1906, № 1).

У працэсе падбору глосаў у беларускай мове пачатку XX ст. вызначаюцца дзве дастаткова выразныя заканамернасці.

1. Беларускія адпаведнікі ў асноўным падаваліся да слоў, для якіх пачатак XX ст. з'яўляўся перыядам непасрэднага ўваходжання ў беларускую мову - фактычна для запазычанняў-неалагізмаў: *Министр юстиции (судоў) трэбуе выдалиць яго [дэпутата Косоротова] з Думы, каб суд яго судзйў* (1908, № 11); *Анэксія (прылучэньне) Карэі бадай нікому не была неспадзеўкай, бо яе ўжо пасьля расейска-японскай вайны занялі японцы сваімі войскамі (1910,* № 34). Тыя ж іншамоўныя словы, што ўжо мелі сваю гісторыю ў беларускай моўнай сістэме, функцыяніравалі ў ёй са старабеларускага перыяду, на пачатку XX ст., як правіла, не патрабавалі ўласнамоўных рэпрэзентантаў. Напрыклад, лексема *адміністрацыя,* вядомая беларускай мове з XVII ст. (Булыка 1972, 19), рэгулярна ўжываецца самастойна і глосамі не суправаджаецца: *Администрация* пастанавила сабраць их [падатки] прымусам (1908, № 4); *Адміністрація шахт мае думку выпісаць на работу селян* з *галодных губэрній* (1912, № 21). Аналагічная сітуацыя з лексемамі *гармонія* - вядомая з XVII ст. (Булыка 1972, 79): *Родная мова знаходзіцца ў найлепшай гармоніі з душой свайго народу...* (1912, № 23); *констытуция* - вядомая з XVI ст. (Булыка 1972, 167): *Прэзыдэнт, хоць бы и хацеў, ня можэ исьци проци народа, бо власць яго ня поўная: ён мусиць трымацца констытуции и слухаць парлямэнта* (1908, № 2) або *Шах даў адстаўку министром, што стаяли за народ, и назначыў на их месца людзей, каторые были проци Мэджылиса и констытуции* (1908, № 1). Аднак гэтая заканамернасць не абсалютная. Так, лексема *публикация,* вядомая з XVI ст. (Булыка 1972, 270), у «Нашай Ніве» мае глосу: *..ў законах аб выбарах нима прыказу, каб апроч публикации (абьяўлення) аб уездных зъездах .. разсылаць кожнаму аддзельна павестки* (1906, № 2), а новае запазычанне *манифэст* падаецца без адпаведнікаў: *Новы кароль, малодшы сын забитаго, абьявйў манифэст, што скликае распушчэны парлямэнт, скасуе ўвесь уциск, яки завёў Франко..* (1908, № 3).

Своеасаблівая разнавіднасць гласіравання ўтвараецца ў тым выпадку, калі новае запазычанне тлумачыцца праз больш даўняе: *Йзноў пасьля турэцкай вайны .. прэдставицели и паслы ўсйх гасударств .. аддали на оккупацию (як-бы ў арэнду) Боснию и Герцэговину Аўстрый* (1908, № 16).

2. З цягам часу заўважаецца тэндэнцыя да знікнення з'явы гласіравання запазычанняў. У большасці выпадкаў беларускія глосы да іншамоўных слоў фіксуюцца ў першым дзесяцігоддзі XX ст. Пазней ідэнтыфікатары для запазы-

чаных адзінак у беларускім тэксце патрабуюцца значна радзей, напрыклад: *Нарэсьци [мужыки микалаеуцы] написали ў Гасударственую Думу наказ, каб дабивалися зямли и свабоды, каб трэбовали амнэстии (прашчэньня) ..* (1907, № 15); *Каб заспакоиць Расею, трэба даць амнэстию (д а р а в а ць) ўсйм, адмяниць кару сьмерци* (1908, № 4); *Атнэстія не абойме спраў тэрорыстычных..* (1913, № 13); *Селяне дзівуюцца, што яны не трапілі пад а м ністію 21 лютаго* (1913, № 13).

Гэтая асаблівасць сведчыць аб істотным паглыбленні засваення запазычанняў непасрэдна ў межах разглядаемага перыяду, што ў сваю чаргу з'яўляецца паказчыкам надзвычай высокай інтэнсіўнасці моўных працэсаў у беларускай мове пачатку XX ст.

Як паказвае матэрыял, у большасці сваей у глосах адпаведнікі да іншамоўных слоў павінны былі служыць перш за ўсё сродкамі для палягчэння працэсу ўваходжання запазычанняў у лексічную структуру беларускай мовы, што выглядала цалкам лагічным на першасным этапе семантычнай адаптацыі. Пры пошуку беларускага адпаведніка да запазычанага слова ў гэты час дамінуючай была задача яго тлумачэння, а не замены. З двух магчымых варыянтаў рэакцыі на запазычанне - імкненне авалодаць іншамоўным матэрыялам і імкненне пазбавіцца ад іншамоўных элементаў - для беларускай мовы пачатку XX ст. быў актуальны першы варыянт. Пурыстычныя памкненні пры падстаноўках уласнамоўных адпаведнікаў да запазычаных лексем, як можна меркаваць, прыкметнай ролі не адыгрывалі.

На пачатку XX ст. семантычна суадносныя беларускія і іншамоўныя адзінкі не толькі ўтвараліся ў ходзе гласіравання, але і функцыяніравалі ў лексіка-семантычнай сістэме мовы ў цэлым. У такім выпадку магчымасць з'яўлення дублетных пар перш за ўсё залежала ад тыпу значэння, носьбітам якога выступала запазычанне.

У найменшай ступені схільнымі да дублетнасці былі словы-тэрміны. Іх устойлівасць і незаменнасць тлумачыцца тым, што «з імі звязана дакладнае абазначэнне аб'ёму паняцця, выяўленне яго важнейшых прымет» (Сорокин 1965, 64). Пошук уласнамоўных намінацый для тэрміналагічных паняццяў, якія маюць устойлівыя назвы іншамоўнага паходжання, - задача дастаткова складаная і да таго ж неапраўданая рэальнымі патрэбамі мовы. У адпаведнасці з гэтым іншамоўныя лексемы тэрміналагічнага характару на беларускай моўнай глебе пачатку XX ст. рэгулярна выступалі як безэквівалентныя адзінкі: *У імя паўнаты агульналюдзкой цывілізацыі усе народнасьці прызваны да працы, да жыцьця..* (1912, № 22); *Німа дзіва тады, што і вядомы Солоневіч з Гоодны, квапіўся на гэткую субсыдію* (1913, № 2); *Без крэдыту ня можэ развівацца ні гаспадарка, ні рэмясло, ні гандэль* (1912, № 12-13). Тлумачацца яны толькі з дапамогай разгорнутых дэфініцый: *Нядаўно на заводзи Эпштэйна, што выробляе скуры, рабочые пачали дамагацца, каб вярнуць плату за работу.. За гэта Эпштэйн зрабйў локаут: затрымаў завод и выдалйў усих рабочых* (1908, NQ 3); *У прыродзе усё змяняецца адно другим, змяняецца паволи, памаленьку и гэта павольнае змяненне у навуцы называецца эволюцией* (1906, № 4); *Скончыўшы пачатковую школу, дзеці вучацца ешчэ праз тры гады, але ўжо большых навук: гісторыі, географіі (навука аб зямлі) I шмат іншых* (1910, NQ 22).

З цяжкасцю падлягаюць эквівалентным заменам і іншамоўныя словы з прадметным значэннем, што абумоўлена іх цеснай сувяззю з канкрэтнымі рэаліямі рэчаіснасці. На пачатку XX ст. такія запазычанні, як правіл[Л], манапольна займалі адпаведную семантычную нішу: *авіатор, вагон, вакзал, пракламація.* Паказальнай з'яўляецца сітуацыя з лексемамі *аэраплан \ самалёт,* якія на пачатку XX ст. перадавалі несуадносныя паняцці: запазычанне *аэраплан* азначала 'лятальны аппарат' *(Aeropian padniaOsia па strasennuju wysyniu i, jak ptuska, расай kupacca й pawietry.* 1911, № 22), а слова *самалёт* мела значэнне 'разнавіднасць кроснаў' *(Krosny-s a m a I o ty й nasym krajujesce maia wiadomy, i ich spatykajemo toiki pa dwaroch,* 1911, № 8).

З большай лёгкасцю працэс замяшчэння сродкамі прымаючай мовы працякаў у адносінах да запазычаных слоў, якія перадаюць спецыялізаваныя абстрактныя паняцці. Шырыня паняційнага аб'ёму і шматграннасць семантыкі такіх

іншамоўных адзінак спрашчаюць падбор іх адпаведнікаў (ва ўсякім разе, частковых): *Родная мова знаходзіцца ў найлепшай гармоніі з душой свайго народу* (1912, № 23) і *Гэтые 4 мужыкі ўвесь час бунтавали и разстроили саглас: яны падбунтавали гвалтам перайсци на казённую кватэру..* (1907, № 6); *Павэдлуг гэтай стацьці земля дзеліцца на тры класы: на среднюю, добрую і найлепшую. Гэта значыць I, II і III класа* (1910, Nq 8) і *Назначаюцца пяць разрадоў лэнсіі: першы -218 руб. у год, другі -160 руб., трэйці - 108 руб., чацьвёрты - 75 руб. і пяты - 36 руб.* (1912, № 6).

Пры ўзаемадзеянні запазычанняў з лексіка-семантычнай сістэмай прымаючай мовы працэс контрнамінацыі, у ходзе якога адносіны паміж рознамоўнымі адзінкамі характарызуюцца імкненнем да максімальнага семантычнага збліжэння, звычайна дапаўняецца разнастайнымі дыферэнцыяльнымі працэсамі. Так, суадносныя па значэнні запазычаныя і ўласнамоўныя словы паступова набываюць спецыфічныя семантычныя адценні або разводзяцца па асобных самастойных функцыянальных і стылістычных сферах (гл. Биржакова... 1972, 298-332; Муромцева 1985, 97-100).

У беларускай мове пачатку XX ст. названая разнавіднасць рэакцыі семантычнай сістэмы мовы-рэцыпіента на іншамоўныя элементы праявілася дастаткова выразна. Толькі зрэдку іншамоўныя і беларускія лексемы можна залічваць да семантычных дублетаў, напрыклад, лексемы *баталія \ бойка: На праводным тыдню ў нашым рэсторани была надта вяликая баталия. Бились, хто чым папаў: киями, кулаками и бутэльками* (1907, № 18) і *Убіўств найбольш здарылося падчас бойкі памеж пьяных ды ешчэ дзеля нажывы* (1910, № 6).

У большасці ж выпадкаў запазычанне і беларускае слова ўжываліся дыферэнцыравана. Найчасцей назіраецца *семантычнае* размежаванне ўласнамоўных і іншамоўных лексем. Прывядзём некалькі прыкладаў.

Лексемы *штраф - кара - пеня.* Кожная з іх перадае адценні значэння агульнага паняцця 'мера ўздзеяння за якую-н. правіннасць; пакаранне': нямецкае запазычанне *штраф* служыла для абазначэння паняцця 'грашовае спагнанне за якую-небудзь правіннасць' *{..кали дазнаюцца, што хто таргуе гарэлкай, то будзе плациць штраф 25 руб. на грамадзкие патрэбы,* 1908, № 7; *Case abwinawacenych аргаййаіі insych zasudzili na straf, a insych u astroh,* 1911, Ne 24); тэрмін лацінскага паходжання *пэня* ўжываўся ў значэнні 'дадатковая плата за пратэрміноўку якіх-н. грашовых выплат (падатку, пазыкі і пад.); разнавіднасць штрафу' *(У нашай воласьці [м. Любонічы, Мінск. губ. Бабр. пав.] быў мірскі капітал. З гэтых грошэй селянам нашым выдавалася пазыка на 4 працэнты, а калі на тэрмін хто не плаціў, то Ішлі пэні (штрафы),* 1910, № 13; *У некаторых селян столькі панарастало працэнтоў і пэні, што цяпер прыйдзецца плаціць у двайне, а то і болей, чым пазычалі..* 1910, № 13); уласнамоўная ж лексема *кара* мела найбольш агульную семантыку і азначала 'рознае па ступені цяжкасці спагнанне за якія-н. злачынствы' *(Уступіў на пасад (трон) новы кароль - Альбэрт, і абвесціў, што касуюцца ўсе кары, ніжэй 3 месяцоў турмы, 1910,* № 1; *Зняты адміністраціўные кары..* 1913, № 9; *..уважаючы на их [мужыкоў] скруху, суд пастанавйў прасиць замяниць им кару смерци катаргай,* 1907, №10;. *.раней ці пазней, на душагубцу спадзе заслужэная кара,* 1913, № 42).

Лексемы *фрукт - плод.* Лексема *фрукт* перадавала паняцці 'садавіна' *(Начал ьнік жалезнай дарогі забараніў прадажу агародніны і фруктоў на ўсіх станціях дарогі,* 1914, Nq 33) і 'ядомая частка некаторых раслін, што развілася з завязі' *(Гатункі яблык і ігруш па сваіх садох джэрзейцы пазаводзілі такіе, якіх мала гдзе і ёсць, дый так іх цацкаюць, што фрукты на іх растуць на зьдзіў вялізарные,* 1910, № 28), а лексема *плод* - паняцці 'вынік, прадукт якой-н. дзейнасці' *(Дзеля гэтаго вітаючы ад усяго сэрца аткрыцьце першай выстаўкі у нашым краю хатніх вырабоў, якую устроіло Таварыство, мы усё-ж такі звертаем яго увагу на тое, што тады толькі праца яго прынясе плады, калі яно паложыць у фундамент арыгінальны народны рысунак,* 1913, № 11; *Na RadaQnicu rabili doma abied, a na hety abied skladalisia plady Qwaskrossaho zyccia cielaty, jahniaty, parasiaty, syr, jajki, maslo* (1910, № 16-17) і 'зародак у млекакормячых' *(Карова заўсягды так моцна плод выпихаець, што целё родзиц-ца ў пяць або шэсць натух..,* 1908, № 6).

Як відаць, беларускія адпаведнікі ў такіх парах частковых міжмоўных сінонімаў аказваюцца, як правіла, больш шырокімі па семантыцы і недастаткова спецыялізаванымі.

Нярэдка таксама іншамоўныя і беларускія лексемы адрозніваюцца ў *функцыянальных* адносінах, напрыклад, лексемы *анархія* і *безладзьдзе:* лексема *безладзьдзе* ў значэнні 'беспарадак, неразбярыха' мае статус агульнаўжывальнага слова (.. *зразумеўшы, што ўсё гэта [раздзел гасударства] зрабілося ад таго безладзьдзя, якое панавала ў Польшчы, яны [палякі], каб паправіць беду, задумалі завясьці у сябе констытуцію,* 1910, № 22), а лексема *анархія* ў выглядзе сваіх вытворных *анархіст, анархістычны* ўжываецца як кампанент грамадска-палітычнай тэрміналогіі *(Бенткоўскаго недаўно арыштавали на вулицы разам з яго таварышэм за тое, што яны належэли да партии а н архистоў,* 1907, № 17; *Догель кажэ, што трэба збольшыць кару за анархістыч н ые творы, каторые падбіваюць на убіўства каралёў,* 1913, № 11).

Аналагічная сітуацыя з функцыянальным размежаваннем лексем *бунт* у значэнні 'стыхійнае паўстанне, мяцеж, праяўленне незадавальнення' *(U Canhsy padniaOsia narodny bunt,* 1910, № 15; *Апошнімі часамі пайшлі бунты у духоўных школах,* 1912, Nq 49-50) і *рэвалюцыя* ў значэннях 'карэнны пераварот у жыцці грамадства' *(Трэба сказаць, што ў Пэрсии за народ стаяла ўсё духавенства и ў гэтай рэвалюции йшло з народам проци шаха,* 1908, № 1); 'карэнныя прагрэсіўныя змены ў якой-н. галіне, якія прыводзяць да абнаўлення, удасканалення чаго-н.' *(Ale wypauniennie hetych reform zrabitoby poOnyju rewolucyju и йргайіеппі krajem,* 1910, №2).

Семантычная і функцыянальная дыферэнцыяцыя магла дапаўняцца і адрозненнямі ў *стылістычнай* афарбоўцы запазычаных і спрадвечных слоў, як, напрыклад, у радзе лексем, звязаных агульным семантычным кампанентам 'аб'яднанні людзей у грамадстве'; *арцель - грамада - кампанія - партія - саюз - таварыства - трупа - хаўрус - хэўра.* На пачатку XX ст. аб'яднанні па прафесійнай прымеце абазначаліся лексемамі *арцель, хаўрус (Блізка па ўсіх большых вялікарускі гарадох даўно ўжо пазакпадаліся «арцелі» (хаўрусы) рэмесьнікоў..,* 1912, № 24), *трупа* [акцёраў] (У *1911 гаду трупа артыстоў-беларусоў першы раз паставіла рад тэатральных прэдстаўленьнёў на беларускай мове..,* 1913, № 16-17). Група людзей, аб'яднаных агульнымі інтарэсамі, мела назву *таварыства (Трэба, каб наша справа перэхадзіла у нашы рукі, у рукі сельска-гаспадарскіх селянскіх таварыств,* 1913, № 13). Аб'яднанне палітычных аднадумцаў іменавалася лексемамі *партія (У мінулым тыдню адбыўся з'езд п а р т іі «націоналістоў».* 1912, № 9), *саюз («Минское Слово» .. sto nalezyc da «nacionalnaho sojuza », piejato chwalu «sojuznikom»,* 1911, № 6), якія адносіліся да сферы грамадска-палітычнай тэрміналогіі. А значэнне 'разнастайныя сяброўскія ці свецкія аб'яднанні' рэалізоўвалася праз лексемы *кампанія (У ваколіцах Несьвіжа кампанія маладых хлапцоў беларусоў-каталікоў у часе запуст устроіла тэатр у вясковай хаці.* 1913, № 12-13), *грамада (Возьмем, напрыклад, звычай валасных сходоў, дзе збіраецца ўся валасная г р а м а д а, усе «людзі» волаcьці..,* 1912, № 5), *хэўра (К таму часу ў Берастэчка К дружыне казачай Прыблукаўся пан Патоцкі С хэўраю лядачай.* 1913, № 29), з якіх апошняе слова, акрамя своеасаблівых сэнсавых адценняў, мела яшчэ і зніжаную стылістычную афарбоўку.

Дыферэнцыяцыя запазычаных і спрадвечных слоў на пачатку XX ст. адбывалася павольна, яе канчатковыя вынікі знаходзяцца па-за межамі перыяду. Словы ў міжмоўных сінанімічных радах маглі выходзіць за рамкі найбольш характэрнай для іх семантыка-стылістычнай або функцыянальнай сферы, выступаючы як узаемазамяняльныя адзінкі. Напрыклад, для прааналізаванага ланцужка лексем *арцель - грамада - кампанія - партія - саюз - таварыства - трупа - хаўрус - хэўра* паказальнымі ў гэтым сэнсе з'яўляюцца наступныя кантэксты: *Цяпер аказалася, што на гэтым добра выходзиць и казна, и рабочые; дык и ў Пермскай губэрнии перадаюць ешчэ адзин завод у руки рабочай хэўры* (1907, № 4); *На дварэ сабралася хэўра вясковых гаспадароў ..* (1913, N° 18); *А ешчэ тые фабрыканты и купцы багатшые часта злучаюцца ў саюзы, хэўры..* (1907, № 28); *Вось затым, каб добра распазнаць, чаго патрэбу-*

ець их жыццё рабочего люду, што им бракуець .. кожная такая грамада злучаецца ў с а юз, каторы завецца партия (1907, Nq 10).

Характэрна, што ў беларускай мове пачатку XX ст. у ходзе працэсу дыферэнцыяцыі запазычаных і спрадвечных слоў фактычна не прымяняліся схемы, ужо адпрацаваныя ў іншых блізкіх славянскіх мовах, у прыватнасці рускай. Напрыклад, слова *кампанія* ў значэнні 'аб'яднанне купцоў або прамыслоўцаў', якое ў рускай мове сфарміравалася яшчэ ў дапятроўскую пару (Биржакова... 1972, 322), ужывалася ў іншым сектары адпаведнага семантычнага поля (гл. вышэй).

Такім чынам, можна канстатаваць наступныя вынікі ўплыву запазычанняў на лексіка-семантычную сістэму беларускай мовы пачатку XX ст.: а) актывізацыя спрадвечных слоў; б) папаўненне лексічных мікрагруп і больш дакладная семантычная дыферэнцыяцыя лексем у іх скпадзе; в) змены ў функцыянальных і экспрэсіўных уласцівасцях як запазычаных, так і беларускіх лексем.

У цэлым пачатак XX ст. - надзвычай важны этап у гісторыі ўзаемаадносін запазычаных слоў з беларускай лексіка-семантычнай сістэмай. Аб'ектыўнай непазбежнай адзнакай і вынікам тагачаснай моўнай сітуацыі з'яўляліся паралельныя рознамоўныя лексічныя выкарыстанні. Пры гэтым выразная тэндэнцыя да семантычнай дыферэнцыяцыі прывяла да пераважання ідыяграфічных сінонімаў сярод запазычаных і спрадвечных слоў. Дублетныя ж адносіны ў беларуска-іншамоўных лексічных парах і радах былі больш рэдкай з'явай (напрыклад, сярод прааналізаваных лексем поўная семантычная эквівалентнасць запазычаных і беларускіх лексічных адзінак назіраецца прыблізна ў адным выпадку з пяці). Намінацыйныя і дыферэнцыяльныя працэсы, выкліканыя прытокам іншамоўных элементаў у новую беларускую літаратурную мову, на пачатку XX ст. не былі завершены. Тым не менш у гэты перыяд заклаліся грунтоўныя асновы для падрыхтоўкі перамен і паступовага вырашэння моўных калізій, а адносіны, якія склаліся паміж запазычанымі і беларускімі словамі, у многім прадвызначылі іх далейшы лёс у сістэме беларускай мовы.

Л ІТАРАТУРА

Биржакова Е.Э., Войнова Л.А., Кутина Л.Л. Очерки по исторической лексикологии русского языка XVIII века. Языковые контакты и заимствования. Л., 1972.

Булыка А.М. Даўнія запазычанні беларускай мовы. Мн., 1972.

Гапоненка І.А. Лексічныя запазычанні ў беларускай мове пачатку XX ст. і асаблівасці іх фармальнай адаптацыі // Беларуская лінгвістыка. 1999. № 49. С. 62-68.

Лексика русского литературного языка XIX - начала XX века. М., 1981.

Муромцева О.Г. Розвиток лексики украГнськоТ літературно'і' мови в другій половині XIX - на початку XX ст. Харків, 1985.

Сорокин Ю.С. Развитие словарного состава русского литературного языка. 30-е - 90-е годы XIX века. М.; Л., 1965.

Паступіў у рэдакцыю 24.03.05.

Ірына Алегаўна Гапоненка - кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры гісторыі беларускай мовы.

ВЛ. ЗРАЗІКАВА

СЕМАНТЫЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА ІНДЫВІДУАЛЬНА-АЎТАРСКІХ НЕАЛАГІЗМАЎ-ПРЫМЕТНІКАЎ У МОВЕ МАСТАЦКІХ ТВОРАЎ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XX ст.

Определяется смысловая структура окказионализмов-прилагательных в языке художественной литературы первой половины XX в. Раскрываются особенности их функционирования в условиях определенного контекста.

The article deals with determination of meaning's structure of the occasionalisms-adjectives in the language of the works of art in the first decade of the XX century. The peculiarities of their functioning in the conditions of the definite context are examined.

Беларускія пісьменнікі на пачатку XX ст. уводзілі ў моўную структуру сваіх твораў індывідуальна-аўтарскія неалагізмы (аказіяналізмы): ***вязенне*** 'адзенне вязня' *(...Як вязень у доўгім вязеньні, І Ўтаміўся я песьняй зьвінець**

* Пры цытаванні твораў захоўваюцца арфаграфічныя асаблівасці арыгіналаў.